Петэр ДЭТМАР:

# «ІНВЕСТЫЦЫІ І КААПЕРАЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ — У ГЭТЫМ МЫ ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ!»



**АБ'ЁМ узаемнага гандлю Беларусі і Германіі ў 2008 годзе склаў больш за тры з паловай мільярды долараў. У 2009 годзе сусветны фінансавы крызіс зрабіў сваю справу, і тавараварот знізіўся. Зразумела, што ў такіх умовах абодва бакі павінны шукаць новыя свежыя рашэнні, якія дапамаглі б мінімізаваць уплыў крызісу на беларуска-германскія гандлёва-эканамічныя адносіны. Якія прапановы ў гэтай сувязі зыходзяць з германскага боку? На гэтае і іншыя пытанні «Звязды» адказвае намеснік кіраўніка місіі, дарадца-пасланнік Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Петэр ДЭТМАР.**

— У 2009 годзе двухбаковы тавараварот сапраўды знізіўся ў параўнанні з папярэднім годам, — сказаў спадар ДЭТМАР. — Па звестках Федэральнага статыстычнага ведамства Германіі, у перыяд са снежня па кастрычнік 2009 года аб'ём гандлю знізіўся на 18,4 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года. Таму ў эканамічнай сферы дзейнасць Пасольства Германіі і Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь была накіравана на пераадоленне гэтай негатыўнай тэндэнцыі. Так, Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі арганізавала ў 2009 годзе сем паездак для нямецкіх прадпрымальнікаў у Беларусь, у якіх узялі ўдзел каля 130 прадстаўнікоў дзелавых колаў Германіі. Нягледзячы на зніжэнне тавараабароту, колькасць стэндаў германскіх фірмаў на найважнейшых эканамічных выставах у Беларусі засталася на ранейшым узроўні. 3-і Дзень нямецкай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь у чэрвені мінулага года, арганізаваны Нямецка-беларускім эканамічным клубам і Прадстаўніцтвам нямецкай эканомікі пры садзейнічанні Пасольства Германіі, быў прысвечаны сельскай гаспадарцы і прыцягнуў шэраг нямецкіх прадпрымальнікаў. Важныя імпульсы для двухбаковых эканамічных сувязяў дало 5-е пасяджэнне Германска-Беларускага савета эканамічнага супрацоўніцтва, якое адбылося ў чэрвені пад кіраўніцтвам дзяржаўнага сакратара Федэральнага міністэрства эканомікі і тэхналогій Бернда Пфафенбаха і міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргея Мартынава.

***— Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва з'яўляецца неад'емнай часткай узаемадносінаў дзвюх краін. Якія ж нямецкія землі ў большай ступені зацікаўленыя ў пабудаванні канструктыўных дзелавых адносінаў з беларускімі рэгіёнамі?***

— Партнёрскія сувязі паміж гарадамі Германіі і Беларусі ажыццяўляюцца ў асноўным у культурнай і грамадскай сферах. Але ёсць і выключэнні. У якасці прыкладу выдатных эканамічных адносінаў можна прывесці партнёрскія сувязі паміж Магілёвам і Айзенахам (Цюрынгія). У прыватнасці, яны знаходзяць сваё выяўленне ў цесных і плённых для абодвух бакоў кантактах паміж Бізнэс-інавацыйным цэнтрам Айзенаха, Тэхнапаркам і свабоднай эканамічнай зонай Магілёва. Інтэнсіўныя эканамічныя сувязі існуюць таксама на рэгіянальным узроўні, напрыклад, паміж федэральнай зямлёй Брандэнбург і Мінскай вобласцю.

***— У чэрвені мінулага года адбылося першае з 1996 года і пятае па ліку пасяджэнне Германска-Беларускага савета эканамічнага супрацоўніцтва. Пасля такога доўгага перапынку неабходна паскарэнне рэалізацыі наяўнага патэнцыялу нашых краін. Што ў гэтай сувязі гатовая здзейсніць Германія ў найбліжэйшай будучыні?***

— 5-е пасяджэнне Германска-Беларускага савета эканамічнага супрацоўніцтва ў Мінску прадэманстравала вялікую ўзаемную зацікаўленасць у паглыбленні двухбаковых гандлёвых адносінаў. На гэты год запланавана чарговае пасяджэнне Савета ў Германіі. Разам з 2-м Германска-Беларускім энергетычным форумам, які пройдзе ў рамках Гановерскага кірмашу ў сёлетнім красавіку, прапануецца правесці ў Германіі таксама і Беларускі інвестыцыйны форум. Паводле дамоўленасці, якая была дасягнута падчас сустрэчы паміж Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам і старшынёй Усходняга камітэта нямецкай эканомікі Клаўсам Мангольдам у лістападзе 2009 года, плануецца стварэнне двухбаковай рабочай групы, для ўдзелу ў якой будуць запрошаныя высокапастаўленыя прадстаўнікі германскіх прадпрыемстваў.

***— У Беларусі зарэгістравана каля 340 прадпрыемстваў з удзелам германскага капіталу. Якія новыя перспектыўныя праекты можа прапанаваць германскі бок у хуткім часе?***

— Германскія прадпрыемствы прымаюць свае рашэнні па інвеставанні за мяжой, а выходзіць, і ў Беларусі, самастойна. Аднак цяпер для шматлікіх прадпрыемстваў першачарговай задачай з'яўляецца пераадоленне наступстваў эканамічнага крызісу. І што датычыцца новых праектаў на замежных рынках, то тут яны займаюць, хутчэй, стрыманую пазіцыю. Тым не менш германскія партнёры праяўляюць высокую зацікаўленасць у ажыццяўленні інвестыцый і кааперацыйных праектаў у Рэспубліцы Беларусь, перш за ўсё ў такіх сферах, як аднаўляльныя крыніцы энергіі, біягаз і ўтылізацыя адходаў.

***— Якія крокі для актывізацыі супрацоўніцтва ў сферы малога і сярэдняга бізнэсу мае намер зрабіць сёння Германія?***

— Адным з крокаў для актывізацыі супрацоўніцтва менавіта ў сектары малога і сярэдняга бізнэсу з'яўляюцца паездкі прадстаўнікоў дзелавых колаў Германіі, якія арганізоўваюцца Прадстаўніцтвам нямецкай эканомікі ў Мінску пры фінансавай падтрымцы Федэральнага міністэрства эканомікі і тэхналогій. У 2008 годзе адбылося пяць такіх паездак, у 2009-м — ужо сем. Шэраг такіх візітаў запланаваны і на 2010 год.

***— Навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне адыгрывае немалаважную ролю ў развіцці партнёрскіх сувязяў. У якой меры яго закрануў сусветны эканамічны крызіс? І якіх інавацыйных прапаноў у гэтай сферы варта чакаць ад Германіі?***

— Па адзнаках пасольства, глабальны фінансавы і эканамічны крызіс не аказаў негатыўнага ўздзеяння на супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы. Здаецца, што тут мы маем, хутчэй, зваротную сітуацыю, тым больш, калі ўлічваць, што ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхналогіях працуюць германскія эксперты Цэнтра міжнароднай міграцыі і развіцця. Шэраг ініцыяваных імі праектаў, перш за ўсё ў сферы аднаўляльных крыніц энергіі, паспяхова рэалізаваныя. Пасольства вельмі зацікаўлена ў паглыбленні супрацоўніцтва паміж германскімі і беларускімі ўстановамі ў галіне адукацыі, навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці. Часта гэта закладае асновы для далейшай эканамічнай кааперацыі.

**Пытанні задавалі Кацярына ДАРАФЕЙЧЫК і Барыс ЗАЛЕСКІ.**

## Медыцына. Экалогія. Здароўе.


CO ORD - MED® GmbH
Coordinationsgesellschaft Medizin

**Урологическая продукция**

- Катетеры
- Катетерный лубрикант
- Имплантационная система Urodex® для лечения стрессового недержания мочи:
  SUI - при стрессовом недержании мочи у женщин
  VUR - при везикоуретеральном рефлюксе у детей
- а также другая урологическая продукция

Hienlohestr. 24 / Eingang E
D-83624 Otterfing (Germany)
Telefon: +49 8024 9927-0
Telefax: +49 8024 9927-27
e-mail: coord-med-gmbh@t-online.de
www.coordmed.com

Московское бюро:
Елена Дубровина
helena@intservice.ru
Тел.:+7 925 585 40 68


## Прамысловасць. Энергетыка. Рэсурсы.


**ВЕНТИЛЯЦИОННАЯ И ПРИВОДНАЯ ТЕХНИКА —**

ebmpapst



ПРЕДПРИЯТИЕ В МУЛЬФИНГЕНЕ (ГЕРМАНИЯ)



ПРЕДПРИЯТИЕ В САНКТ-ГЕОРГЕНЕ (ГЕРМАНИЯ)



ПРЕДПРИЯТИЕ В ЛАНДСХУТЕ (ГЕРМАНИЯ)



**ebm-papst В МИРЕ:**

ebm-papst является ведущим в мире производителем современных промышленных вентиляторов и электромоторов. 17 производственных площадок, 57 торговых филиалов, 10 тыс. сотрудников, количество производимых вентиляторов и двигателей — 50 млн. шт./год, уникальный по своему номенклатурному ряду ассортимент продукции (14,5 тыс. товарных наименований) — все это ebm-papst. Основные производственные площади, исследовательские и инженерные центры, а также Управление находятся в Германии. Компания обозначила свое присутствие практически во всех уголках земного шара: сегодня это 57 филиалов и представительств ebm-papst в 39 странах мира.

**ebm-papst В РАЗЛИЧНЫХ ОТРАСЛЯХ:**

для достижения наилучших показателей вентилятора и двигателя в изделии мы разбираем и рассматриваем специфику применения вентиляторов и двигателей в каждой отдельно взятой отрасли, условия эксплуатации и потенциальные возможности изделия ebm-papst в конкретном применении. Наиболее характерные отрасли применения изделий ebm-papst:

- вентиляционная, климатическая и холодильная техника
- отопительная техника
- бытовая техника
- автомобильная техника
- железнодорожная техника
- телекоммуникация, компьютеры, оргтехника, электроника
- приводная техника
- механизмы и оборудование
- медицинская и лабораторная техника

**ebm-papst В БЕЛАРУСИ:**

для упрощения коммуникации с потребителями, для ускорения и упрощения доставки товара клиентам, а также для оказания эффективной технической поддержки в регионах ebm-papst организовало торговые филиалы на местах. ИООО «ЭБМ-ПАПСТ БЕЛ» — филиал немецких заводов группы ebm-papst — работает на территории Беларуси с 2005 года. Офис и Склад ИООО «ЭБМ-ПАПСТ БЕЛ» находятся в Минске, где поддерживается широкий ассортимент изделий ebm-papst.

**ФУНКЦИИ И ЦЕЛИ ИООО «ЭБМ-ПАПСТ БЕЛ»:**

техническое консультирование и подбор оптимальных изделий из ассортимента ebm-papst, хранение продукции ebm-papst на складе в Минске, прием и обработка заказов, организация доставки до Потребителя, проведение семинаров, организация выставок. Наша цель на рынке Беларуси — обеспечение продукцией, которая, благодаря последним разработкам ученых ebm-papst, позволит Вашим товарам быть неоспоримым лидером на рынке.

Контактная информация:
ИООО «ЭБМ-ПАПСТ БЕЛ»
223010, Беларусь, Минский р-н, 3-й км МКАД,
корпус № 6, комн. 506, 507
почтовый адрес: 220138, г. Минск, а/я 117
тел./факс: (375 17) 385 15 56, 385 15 57, 385 15 58.
E-Mail: info@by.ebmpapst.com
www.ebmpapst.by
www.ebmpapst.com